# Характарыстыка парушэнняў голасу

Склала:
выкладчык
кафедры лагапедыі БДПУ
Лагун Т.Т.

# ГОЛАС –

сукупнасць самых разнастайных па вышыні, сіле і тэмбры гукаў, якія выдаюцца чалавекам пры дапамозе галасавога апарата. Гэтыя гукі могуць служыць для выражэння думак, пачуццяў і адчуванняў (гаворка, спевы, плач) ці ж з'яўляюцца следствам рэфлекторных рухаў мышц гартані (чханне, кашаль і г.д.), якія ўзнікаюць у выніку ўздзеяння на іх тых ці іншых раздражняльнікаў.

# АКУСТЫЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ГОЛАСУ

***Вышыня голаса*** характарызуецца частатой вагальных рухаў галасавых складак у 1 сякунду і рэгулюецца іх напругай.

***Сіла голаса*** вызначаецца амплітудай ваганняў галасавых складак і рэгулюецца адвольна.

***Тэмбр або афарбоўка голаса*** з'яўляецца якаснай характарыстыкай голасу і залежыць ад частаты і сілы ваганняў, якія ўваходзяць у склад таго ці іншага гуку.

***Дыяпазон*** – гэта колькасць тонаў, якую дае голас.

# ПАРУШЭННІ ГОЛАСУ

гэта адсутнасць або парушэнне фанацыі з прычыны паталагічных змен галасавога апарата.

Існуе *два асноўных тэрміна* для абазначэння парушэнняў голасу:

*афанія* – поўная адсутнасць голасу;

*дысфанія* – частковыя парушэнні вышыні, сілы і тэмбру голасу.

# Парушаным будзе лічыцца голас, калі маюцца змяненні хаця б адной з характарыстык голасу:

***парушэнне тэмбру голасу*** праяўляецца ў грубаватасці, ахрыпласці, асіпласці або прыдыханні;

***змена сілы*** выяўляецца ў занадта ціхім або занадта гучным голасе;

***змена вышыні*** тону выяўляецца ў вузкім частотным дыяпазоне, занадта высокай ці занадта нізкай частаце асноўнага тону;

***парушэнне рэзанансу*** выяўляецца ў павышаным або паніжаным насавым рэзанансе.

# Прычыны, якія выклікаюць парушэнні голасу:

1. Арганічныя змены, не звязаныя з перанапружаннем голасу і няправільнай манерай голасавядзення:

- парэзы і паралічы галасавых складак цэнтральнага і перыферычнага характару,
- наваўтварэнні гартані, глоткі, рота і носа,
- прыроджаная або набытая ў выніку траўмы, хваробы паталогія гартані, глоткі, рота і носа.

# Прычыны, якія выклікаюць парушэнні голасу:

2. Арганічныя змены, выкліканыя перанапружаннем голасу і няправільнай манерай голасавядзення:

- кровазліццё ў галасавую складку,
- вузельчыкі галасавых складак,
- патаўшчэнне краёў і пачырваненне галасавых складак.

# Прычыны, якія выклікаюць парушэнні голасу:

3. **Функцыянальныя змены:**
- няправільная манера голасавядзення,
- перанапружанне голасу,
- незахаванне гігіены голасу,
- псіхаэмацыянальныя фактары.

# Прычыны, якія выклікаюць парушэнні голасу:

4. Фактары, якія спрыяюць развіццю парушэнняў голасу:

- алергіі,
- захворванні верхніх дыхальных шляхоў,
- гарманальныя парушэнні,
- разнастайныя шумы – аўтамабільны, музычны, у цэху, у спартыўнай зале, у студэнцкай аўдыторыі і інш.

# КЛАСІФІКАЦЫЯ ПАРУШЭННЯЎ ГОЛАСУ

**ЦЭНТРАЛЬНЫЯ**

***АРГАНІЧНЫЯ***

**ДЫСФАНІЯ И АФАНІЯ ПРЫ ПАРАЛІЧАХ И ПАРЭЗАХ ЦЭНТРАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ**

**(У ДЗЯЦЕЙ З ДЦП)**

***ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ***

**ПСІХАГЕННАЯ (ІСТЭРЫЧНАЯ) АФАНІЯ**

# ПЕРЫФЕРЫЧНЫЯ

## *АРГАНІЧНЫЯ*

ДЫСФАНІІ (АФАНІІ) ПРЫ:

- ХРАНІЧНЫХ ЛАРЫНГІТАХ
- ПАРАЛІЧАХ І ПАРЭЗАХ ГАРТАНІ ПЕРЫФЕРЫЧНАГА ХАРАКТАРУ
- НАВАЎТВАРЭННЯХ (ВУЗЕЛЬЧЫКІ, ПАПІЛОМЫ, ФІБРОМЫ)
- ПАСЛЯ ЎДАЛЕННЯ ЗЛАЯКАСНЫХ І ДОБРАЯКАСНЫХ НОВАЎТВАРЭННЯЎ
- КРОВАЗЛІЦЦІ Ў ГАЛАСАВУЮ СКЛАДКУ
- ПРАФЕСІЙНЫМ ТРАХЕІЦЕ
- ПРЫ РЫНАЛАЛІІ І РЫНАФАНІІ
- ПРЫ ЗНІЖЭННІ СЛЫХУ

## *ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ*

- ГІПАТОНУСНАЯ ДЫСФАНІЯ (АФАНІЯ)
- ГІПЕРТОНУСНАЯ ДЫСФАНІЯ (АФАНІЯ)
- СПАСТЫЧНАЯ ДЫСФАНІЯ
- ФОНАСТЭНІЯ
- ПАТАЛАГІЧНАЯ МУТАЦЫЯ

# Літаратура

1. Лаўрова, А.В. Парушэнні голасу / А.В. Лаўрова і інш.- М.: Выд.цэнтр «Акадэмія», 2006. – 128 с.
2. Арлова, В.С. Парушэнні голасу / В.С.Арлова. – М.: Астрэль, 2008. – 220 с.